## РИМО-КАТОЛИЦИЗМ

***Натальля Анофранка,***

***малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі***

# ПАЛІТЫКА ЎЛАДАЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў АДНОСІНАХ ДА ЖАНОЧЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ КАТАЛІЦКІХ КЛЯШТАРАХ У КАНЦЫ XVIII СТ. – 1843 Г. (па матэрыялах беларуска-літоўскіх губерняў)

Проаналізовано основні напрями політики Російської імперії щодо жіночих навчальних закладів при римо-католицьких і греко-католицьких монастирях у білорусько-литовських губерніях від часу приєднання зазначених територій і до ліквідації цієї форми жіночої освіти в 1843 р.

***Ключові слова****: Російська імперія, жіночі католицькі навчальні заклади, чернечі ордени, монастирські пансіонати.*

Далучэнне зямель былога ВКЛ да Расійскай імперыі практычна не закранула сістэму жаночай адукацыі, якая склалася на гэтых тэрыторыях у другой палове XVIII ст. Асноўнымі формамі навучання былі: хатняя адукацыя (якая давала бацькам магчымасці найбольш актыўнага ўплыву на фарміраванне яе зместу); прыватная (засяроджаная ў нешматлікіх прыватных пансіёнах), а таксама кляштарная, якая ў рэчышчы агульных тэндэнцый (уплывы ідэй Асветніцтва, працэсы фемінізацыі культуры і ўздзеяння моды) у значнай ступені набывала свецкі змест. Але нягледзячы на відавочную актуальнасць гэтай праблемы, у гістарыяграфіі маюцца толькі асобныя згадкі пра навучальныя установы пры каталіцкіх і ўніяцкіх ордэнах у Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст.[1]

Мэта артыкула – выявіць асноўныя напрамкі палітыкі ўлады Расійскай імперыі адносна жаночых кляштарных навучальных установ, абапіраючыся на матэрыялы беларуска-літоўскіх губерняў, і паказаць, якое месца займалі жаночыя навучальныя ўстановы пры манаскіх ордэнах у сферы жаночай адукацыі ў беларуска-літоўскіх губернях.

Найбольшая канцэнтрацыя каталіцкіх кляштарных пансіёнаў у канцы XVIII – пачатку XIX ст. была ў Вільні. У 1805 г. там дзейнічалі пансіёны бернардынак, бенедыктынак, кармялітак, марыявітак, візітак, базыліянак[2] . Па фрагментарным дадзеным, на беларускіх землях найбольш буйнымі на пачатку XIX ст. былі базыліянскія вучылішчы ў Оршы і Віцебску[3] . Так, у аршанскім базыліянскім вучылішчы ў 1802 г. навучалася 20 дзяўчынак ва ўзросце ад 6 да 14 год[4] . У 1803 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях усяго дзейнічала 4 невялікіх (1–2 класы)

кляштарных вучылішчы (базіліянскае – ў Полацку, марыявітак – у Віцебску, два вучылішчы сясцёр міласэрнасці – ў Крэслаўцы і Асвеі)[5].

Адукацыйныя праграмы ў жаночых каталіцкіх навучальных установах былі рознага ўзроўню. У вучылішчы марыявітак у Віцебску вучылі чытаць і пісаць па-польску, а таксама некаторым жаночым працам. Сёстры міласэрнасці ў Крэслаўцы выкладалі чытанне, пісьмо (па-польску і па-руску), катэхізіс, свяшчэнную гісторыю, лацінскую мову, арыфметыку, геаграфію і пачатковую гісторыю. У вучылішчы гэтага ж ордэна ў Асвеі, акрамя катэхізіса, жаночага рукадзелля, чытання і пісьма па-польску і па-руску, дзяўчынак вучылі грацы на фартэпіяна і гітары[6]. У дакументах адзначалася, што ў Аршанскім базыліянскім вучылішчы дзяўчынкам выкладалася нямецкая мова[7].

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. кіраўніцтва Віленскага універсітэту спрабавала ўзяць пад кантроль жаночыя навучальныя ўстановы пры каталіцкіх кляштарах. Так, у 1809 г. падымалася пытанне аб падпарадкаванні Віленскаму ўніверсітэту школы для бедных дзяўчынак пры базыліянскім кляштары ў Віцебску[8]. У 1811 г. з-за таго, што кіраўніцтва Віленскага ўніверсітэта спрабавала распаўсюдзіць кантроль за жаночай школай пры кляштары візітак у Вільні, адбыўся канфлікт паміж рэктарам універсітэту і Віленскім каталіцкім біскупам. Рэктар універсітэту Ян Снядзецкі настойваў на неабходнасці кантролю за адукацыяй дзяўчынак у манастырах, а таксама на неабходнасці кантролю за фундушам, які выдзяляўся манастыру на адукацыю бедных і сірот[9]. У скарзе міністру народнай асветы графу А. Разумоўскаму Віленскі біскуп, што «падобны нагляд ствараў бы розныя спрэчкі між Віленскім універсітэтам і епіскапам, што гэты нагляд не спалучаецца са статутамі і правіламі манастыроў» *(рус. мова)*[10].

У выніку граф А. Разумоўскі прыняў рашэнне: «жаночыя манастыры знаходзяцца ў ведамстве епархіяльнага епіскапа, па частцы выхавання і навучання ў іх свецкіх дзяўчынак павінны быць пазбаўлены залежнасці ад вучылішчнага начальства, якое не павінна ўваходзіць ні ў якія распараджэнні па гэтым прадмеце» *(рус. мова)*[11]. Такім чынам, жаночыя навучальныя ўстановы пры каталіцкіх ордэнах да сярэдзіны 30-х гг. XIX ст. заставаліся па-за кантролем вучылішчнага начальства. У выніку гэта сістэма жаночай адукацыі развівалася хаатычна, і ў той жа час досыць актыўна. Актыўнаму развіццю спрыяла павелічэнне попыту на жаночую адукацыю сярод мясцовага дваранства, для якога адукацыя і выхаванне дачок стала ўсвядомленай неабходнасцю.

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. лідарам сярод манаскіх ордэнаў у сферы жаночай адукацыі стаў ордэн сясцёр марыявітак. У першую чаргу гэта было абумоўлена мэтай дзейнасці ордэна – «карміць сірот і вучыць бедных дзяўчын». Адукацыя навучальных установах марыявітак была танная або бясплатная. Таксама марыявіткі папулярызавалі дзейнасць свайго ордэна і жаночых навучальных устаноў сярод жыхароў краю. Напрыклад, распаўсюджваліся абвесткі, у якіх паведамлялася: «Ордэн сёстраў Марыявітак мае гонар данесці да шаноўнай грамадскасці, што ад часу свайго стварэння (1737 г.) займаецца адукацыяй бедных паненак [...]. Адкрылі ва ўсіх кляштарах публічныя школы для паненак, у якія будуць прымаць без аплаты і без розніцы стану, рэлігіі і

ўзросту і будуць вучыць чытанню і пісьму, арыфметыцы і ўсялякім дамскім працам» *(пол. мова)*[12].

Адукацыйную дзейнасць ордэна марыявітак падтрымалі ўплывовыя асобы заходніх губерняў, якія спрыялі вяртанню ім будынкаў, якія раней былі канфіскаваныя, а таксама запрашалі марыявітак у свае родавыя маёнткі[13]. Напрыклад, у 1819 г. Тэафілія Плятэр у сваім маёнтку каля в. Здолбіцы на ўласныя сродкі пабудавала кляштар для марыявітак, пры якім быў адкрыты пансіён для дзяўчынак. У дамове падкрэслівалася, што «марыявіткі за сваю працу ў адукацыі аплату браць не прызвычаіліся, бо захоўваюць галоўную мэту паклікання: Любіць і служыць Богу і дзеля яго – бліжняму» *(пол. мова)*[14]. Некаторыя асобы аказвалі ордэну марыявітак у справе адукацыі дзяўчынак і разавую фінансавую дапамогу. Напрыклад, удава Пестэль (народжаная Храпавіцкая), вядомая дабрадзейка, якая жыла ў 20-х гг. XIX ст. у Віцебску, пад час свецкай вечарыны, на якой прысутнічаў генерал-губернатар М. Хаванскі, сабрала ахвяраванняў на суму больш за 500 рублёў і цалкам выкарыстала яе для закупкі неабходнага для віцебскага пансіёна марыявітак[15].

У сферы адукацыі ордэн марыявітак супрацоўнічаў з дабрачыннымі таварыствамі. У 1820 г. была заключана дамова з Віленскім таварыствам дабрачыннасці, паводле якой дзве сястры ордэна павінны былі жыць разам з беднымі дзяўчынкамі-сіротамі ў доме гэтага таварыства. У іх абавязкі ўваходзіла даглядаць дзяўчынак, вучыць іх асновам рэлігіі, жаночым працам, а таксама даваць ім пачатковую адукацыю[16].

У 20-я гг. XIX ст. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў дзейнічала 17 пансіёнаў пры кляштарах марыявітак (у Вільні, у Мсціслаўлі, Мінску, Коўна, Слоніме, Полацку, Оршы, Крожы, Галоўчыне, Віцебску, Гродна, Навагрудаку, Ваўкавыску, Мазыры, Пінску, Халопенічах, Бабруйску)[17]. У гэтых пансіёнах навучалася 465 дзяўчынак рознага ўзросту, з якіх значная колькасць былі сіроты і дочкі збяднелага дваранства[18].

Пасля паўстання 1830–1831 гг. улады Расійскай імперыі, па-сутнасці, ад індыферэнтнага стаўлення да жаночай адукацыі перайшлі да актыўнага ўмяшальніцтва ў гэтую сферу і пачалі разглядаць яе з палітычнага пункту гледжання. Мэтай царскага ўраду было не столькі павысіць узровень адукацыі жанчын, колькі перафарматаваць яе ў адпаведнасці з палітычнымі інтарэсамі. У 1834 г. граф М. Пратасаў, пасля агляду навучальных устаноў Беларускай навучальнай акругі, у дакладзе імператару адзначаў: «дух варожы ўраду і рускай нацыянальнасці асабліва распаўсюджаны ў жаночых школах» *(рус. мова)*[19]. На думку расійскіх чыноўнікаў, найбольш негатыўна ўплывалі навучальныя ўстановы для дзяўчынак пры каталіцкіх кляштарах. У іх, дзякуючы адсутнасці кантролю з боку вучылішчнага начальства, «дух польска-каталіцкай прапаганды мог развівацца без перашкоды» *(рус. мова)*[20]. Гэтых навучальных установаў у беларуска-літоўскіх губернях на 1835 г. налічвалася каля 27, а штогадовая колькасць навучэнак у іх вагалася ад 460 да 780 дзяўчынак[21]. Фактычна, перад уладамі паўсталі дзве задачы – разбурэнне існуючай сістэмы жаночай адукацыі і кардынальная змена навучальных праграм.

Ужо ў 1831 г., каб аслабіць сістэму каталіцкіх навучальных устаноў, улады забаранілі дзяўчынкам уніяцкага, і тым больш праваслаўнага веравызнання, карыстацца іх паслугамі. У адпаведнасці з гэтым распараджэннем губернская адміністрацыя праводзіла рэвізіі жаночых каталіцкіх пансіёнаў на прадмет веравызнання вучаніц. Так, у 1833 г. пры праверцы вучылішча пры кляштары марыявітак у Віцебску дзяўчынак праваслаўнага веравызнання выяўлена не было. Аднак з 25 вучаніц 5 былі ўніяткамі, адна – евангеліцкага веравызнання[22].

У 1835 г. быў выдадзены загад, паводле якога пансіёны, што ўтрымлівалі жаночыя каталіцкія ордэны, павінны былі перайсці ў падпарадкаванне свецкага начальства[23]. У 1837 г. былі вызначаны меры адносна каталіцкіх жаночых пансіёнаў у губернях Беларускай вучэбнай акругі. Яны прадугледжвалі пільны нагляд за дзейнасцю візітатараў для гэтых пансіёнаў; падачу кляштарам інфармацыі пра колькасць і суму фундушаў, на якія ўтрымлівалася жаночая навучальная ўстанова; абавязковую падачу звестак пра колькасць навучэнак, якія ўтрымліваліся за кошт кляштара, а таксама колькасць платных пансіянерак з пазначэннем сумы аплаты. На падставе гэтых дадзеных вызначалася колькасць вучаніц, якую пансіён мог мець на будучыню[24].

Палітыка расійскай улады ў адносінах да жаночых каталіцкіх навучальных устаноў была дастаткова паслядоўнай. Зыходзячы з таго, што кляштарная адукацыя была традыцыйна дастаткова таннай, яна карысталася попытам. У такім выпадку, меры па рэгламентацыі колькасці выхаванак, па-першае, абмяжоўвалі кляштарныя навучальныя ўстановы ў атрыманні дадатковых фінансавых сродкаў. Па-другое, гэтыя абмежаванні стваралі штучны дэфіцыт месцаў у кляштарных пансіёнах і вымушалі бацькоў шукаць іншыя магчымасці даць адукацыю дочкам.

Таксама пад кантроль губернскай адміністрацыі быў пастаўлены адбор кандыдатак на атрыманне адукацыі за кошт кляштарнага фундушу. Намінальна права канчатковага адбору кандыдатак пакідалася за біскупам, але толькі пасля папярэдняга разгляду і зацвярджэння ўсяго спісу вышэйшым кіраўніцтвам краю[25]. З аднаго боку, гэтая мера абмяжоўвала і ставіла пад кантроль каталіцкія структуры ў сферы адукацыі. З другога – расійская адміністрацыя імкнулася распаўсюдзіць стандарты дзяржаўнага апекавання на царкоўную сферу.

Аднак, па сведчанні паліцыі, праверкі кляштарных пансіёнаў па паветах былі малаэфектыўнымі. Прычыну бачылі ў тым, што кіраўніцы кляштараў мелі шэраг магчымасцяў прыхаваць сапраўдную колькасць навучэнак, напрыклад, выдаўшы лішніх або за сваячак манашак, або за простых наведвальніц. Таксама адзначалася, што фальсіфікацыям вынікаў праверак жаночых каталіцкіх пансіёнаў спрыялі і чыноўнікі мясцовага паходжання, якія ў сваёй большасці самі былі каталіцкага веравызнання. На думку адміністрацыі, для іх прыхоўванне колькасці выхаванак, у адпаведнасці з пачуццем фанатызму, не лічылася невыкананнем сваіх абавязкаў[26].

Яшчэ цяжэй было ажыццяўляць кантроль за выкананнем прадпісання абавязковага выкладання ў манастырскіх пансіёнах рускай мовы. Нягледзячы

на неаднаразовыя паўторы гэтага распараджэння, праверка у 1839 г паказала, што «у некаторых вучылішчах пры каталіцкіх кляштарах у Віцебскай губерні ніхто з навучэнак не ведаў рускую мову» *(рус. мова)*[27] .

Праводзячы абмежавальную палітыку ў адносінах да жаночай каталіцкай адукацыі, расійская адміністрацыя ў той жа час не забараніла адкрываць новыя пансіёны. Аднак яны адкрываліся пад наглядам і кантролем з боку вучылішчнага начальства і губернскай адміністрацыі. Напрыклад, у 1836 г. віцебскі грамадзянскі губернатар атрымаў распараджэнне дырэктара вучылішч Віцебскай губерні пра адкрыццё новага жаночага пансіёна пры віцебскім кляштары марыявітак. Перад гарадской і земскай паліцыяй была пастаўлена задача давесці да ведама шырокай публікі і асабліва да дваранства губерні інфармацыю пра адкрыццё гэтага жаночага пансіёну[28] . Навучальная праграма, ўзгодненая і падпісаная кіраўніцтвам Беларускай навучальнай акругі, ўключала: закон Божы, мовы (рускую, французскую і нямецкую); арыфметыку, геаграфію, усеагульную гісторыю, маляванне, музыку, танцы і жаночае рукадзелле. Было пазначана, што ўсе гэтыя прадметы будуць выкладацца на рускай мове (акрамя каталіцкага катэхізіса) і па кнігах, ухваленых вучылішчным начальствам. Да выкладання планавалася прыцягваць настаўнікаў Віцебскай губернскай гімназіі. Па заканчэнні курса навучання дзяўчынкі павінны былі вытрымліваць іспыты ў прысутнасці вучылішчнай адміністрацыі[29] . Паказальна і тое, што дабрачынная дзейнасць – прыём вучаніц у пансіён за кошт кляштара – не прадугледжвалася. Функцыянаванне новага пансіёна марыявітак павінна было адбывацца выключна на камерцыйнай аснове. Поўныя пансіянеркі (навучанне і пражыванне) павінны былі плаціць 350 руб. асігнацыямі на год, паўпансіянеркі (навучанне і абед) – 200 руб. на год. Дзяўчынкі, якія прыходзілі толькі на заняткі, плацілі 120 руб. на год (плата за вопратку і ўрокі танцаў бралася асобна)[30] . У выніку, пад эгідай ордэна марыявітак фактычна была адкрыта свецкая навучальная ўстанова, як па змесце, так і па форме, цалкам падкантрольная вучылішчнаму начальству і па сваім статусе набліжаная да дваранскага павятовага вучылішча. З 1836 па 1839 гг. колькасць вучаніц у гэтым пансіёне павялічылася з 45 да 64[31] .

Такім чынам, калі ў адносінах да былых каталіцкіх пансіёнаў дзяржава прымала абмежавальныя меры, то стаўленне да новых пансіёнаў было іншым. Яны адкрываліся па ініцыятыве і пад эгідай каталіцкага ордэну, але выключна з дазволу вучылішчнага начальства і пры падтрымцы губернскай адміністрацыі. Пільны кантроль за дзейнасцю пансіёнаў, змест навучальных праграм, якія былі максімальна набліжаная да праграм дзяржаўных і паўдзяржаўных навучальных устаноў (узорных і казённых жаночых пансіёнаў), фактычна ў любы момант давалі магчымасць перадаць гэтыя каталіцкія навучальныя ўстановы ў поўную юрысдыкцыю адміністрацыі Беларускай навучальнай акругі.

Абмежавальныя меры ў адносінах да жаночых каталіцкіх пансіёнаў спрыялі іх паступоваму закрыццю. Так, было высветлена, што ў Магілёўскай губерні да 1841 г. пансіёны марыявітак у мястэчку Бялынічы, у гарадах Оршы і Мсціслаўлі былі закрыты з-за «не паступлення» выхаванак[32] . Аднак паступовы працэс

выцяснення каталіцкіх ордэнаў з адукацыйнай сферы жанчын не задавальняў расійскую адміністрацыю. Так, у 1840 г. Віцебскі губернатар, характарызуючы стан адукацыі ў губерні, пісаў, што да гэтага часу манашкі ордэна марыявітак і сясцёр міласэрнасці з'яўляюцца асноўнымі настаўніцамі ў губерні, у руках якіх знаходзіцца ўсё жаночае выхаванне. Ён адзначыў, што займаючыся адукацыяй, сёстры міласэрнасці ўвогуле адхіліліся ад сваіх непасрэдных абавязкаў – апекавання лазарэтамі і багадзельнямі, а сёстры марыявіткі «выхоўваюць у жанчынах рэлігійны фанатызм, не правільнае разуменне грамадзянскасці, адмаўленне ўсяго рускага, а таксама ўкараняюць у жаночую свядомасць прыхільнасць да польскай самабытнасці» *(рус. мова)*[33] . Губернатар прапаноўваў пансіёны марыявітак і сясцёр міласэрнасці замяніць спецыяльнымі установамі для выхавання дзяўчынак. А ў Віцебску стварыць інстытут (па ўзоры Кіеўскага) для выхавання дваранак Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Смаленскай і Пскоўскай губерняў[34] .

У выніку, жаночыя пансіёны пры каталіцкіх ордэнах пачалі закрывацца распараджэннем губернскай адміністрацыі. Так, у 1842 г. па загадзе мінскага губернатара былі закрыты 5 пансіёўнаў пры каталіцкіх кляштарах у Мінску, Слуцку, Глуску, Нясвіжы, Пінску[35] . Афіцыйны загад аб закрыцці ўсіх пансіёнаў, якія ўтрымліваліся жаночымі каталіцкімі кляштарамі ва ўсіх заходніх губернях, быў падпісаны Мікалаем I 4 лютага 1843 г.[36] Кіраўніцы кляштараў абавязваліся падпіскаю аб закрыцці пансіёна, а дзяўчынкі, якія вучыліся ў гэтых пансіёнах, за ўласны кошт былі адпраўлены да бацькоў. Немаёмасныя сіроты павінны былі працягнуць адукацыю ва ўстановах народнай асветы, або іх справа павінна была вырашацца мясцовымі органамі грамадскай апекі[37] .

Такім чынам, ад моманту далучэння зямель былога ВКЛ да Расійскай імперыі і да 1843 г. у развіцці сістэмы жаночых навучальных устаноў пры каталіцкіх і ўніяцкіх кляштарах можна вылучыць два перыяды. Першы перыяд (канец XVIII ст. – пачатак 30-х гг. XIX ст.) характарызаваўся тым, што лідзіруючае становішча ў сферы жаночай адукацыі займалі навучальныя установы пры каталіцкіх жаночых ордэнах. Дзякуючы індыферэнтнаму стаўленню з боку расійскай улады і пазбяганню канфрантацыі паміж вучылішчным начальствам і кіраўніцтвам Каталіцкай царквы, сетка кляштарных пансіёнаў у беларуска-літоўскіх губернях значна пашырылася. Таксама развіццю гэтай формы жаночай адукацыі спрыялі нізкія кошты ці іх адсутнасць, што абгрунтоўвалася статутамі каталіцкіх ордэнаў, бескарыснай індывідуальнай працай манашак, узаемадзеяннем у сферы дабрачыннасці каталіцкіх ордэнаў, дабрачынных арганізацый, а таксама індывідуальных дабрачынцаў.

Другі перыяд (ад падаўлення паўстання 1830–1831 гг. і да 1843 г.) характарызаваўся актыўным умяшальніцтвам у сферу жаночай адукацыі расійскай адміністрацыі. Адукацыя і выхаванне дзяўчынак у заходніх губернях пачалі разглядацца праз прызму палітычных інтарэсаў. І хаця адукацыя, якую давалі кляштарныя пансіёны, не адпавядала ідэалагічным устаноўкам і палітычным інтарэсам расійскай улады, адсутнасць у краі дастатковай колькасці свецкіх жаночых навучальных устаноў вымушала расійскі урад ісці па шляху паступовага

іх знішчэння. Нарэшце ў 1843 г. каталіцкія манаскія ордэны цалкам былі адхілены ад жаночай адукацыі ў заходніх губернях.

1 К истории женского образования в Западной России: (Ист. зап. ко дню 50-летия Вилен., Гродн. и Ковен. гимназий): 1860–1910 / Сост. Г. Я. Киприанович. – Вильна: Губ. тип., 1910; Zaleska I. Pensje żeńskie w Wilnie (1795–1830) / Irena Zaleska Stankiewiczowa. – Wilno: Wydawnictwo Magistratu M. Wilna, 1935. – S. 9; Анофранка Н. В. Сістэма жаночай адукацыі на беларускіх землях у канцы XVIII – першай трэці XIX ст.: патрабаванні грамадства і рэчаіснасць / Анофранка Н. В. // Профсоюзы. Труд. Общество. – 2007. – № 1. – С. 74–78; Зянюк Р. У. Навучальныя установы пры каталіцкіх кляштарах Віцебска ў першай палове XIX ст. / Зянюк Р. У. // III Машеровские чтения. Материалы республиканской научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых учёных. – Витебск: УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2009. – С. 145–146.
2 Zaleska I. Pensje żeńskie w Wilnie… – S. 9.
3 Белецкий А. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования. 1803 г. – 1832 г. Отдел 3. Учебные заведения Витебской и Могилёвской губерний в 1803–1832 гг. / Сост. А. Белецкий. – Вильна: Типография А. Г. Сыркика, 1908. – С. 50.
4 Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива МНП. Т. 1. Учебные заведения в Западных губерниях до учреждения Виленского учебного округа. 1783–1803 / Под. ред. И. П. Корнилова. – СПб.: Изд. М-ва нар. просвещения, 1893. – С. 627–628.
5 Белецкий А. Исторический обзор деятельности… – С. 50.
6 Белецкий А. Исторический обзор деятельности… – С. 51.
7 Сборник материалов для истории просвещения в России. – С. 627–628.
8 Российский государственный исторический архив. – Ф. 733. – Оп. 62. – Д. 143.
9 Там же. – Д. 218. – Л. 4.
10 Там же. – Л. 2.
11 Там же. – Л. 8.
12 Krotka historza zgramadzenia siostr Marzae Vitae, napisana przez jadnę Marzawitku // Dzieje dobroczynności krajowej i zyahraniczniey z wiadomościamiku wydoskonaleniu służacemi. –Wilno: Typografiia A. Marcinowskiego, 1820. – S. 29–30.
13 Ibid. – S. 30, 33.
14 Ibid. – S. 31.
15 Максимилиан Маркс. Записки старика // Віцебскі сшытак: Гістарычны навукова-папулярны часопіс. – 1996. – № 6. – С. 89.
16 Oto są punkta wzajemney umowy zawartey między wileńskim Towarzystwem Dobroczności i klasztorem WW. Panien Maryawitek, podane im przy odezwie Towarzystwa pod dniem 27 kwietnia t. r. pod Nrem 47 // Dzieje dobroczynności krajowej i zyahraniczniey z wiadomościamiku wydoskonaleniu służacemi. – Wilno: Typografiia A. Marcinowskiego, 1820. – S. 279.
17 Krotka historza zgramadzenia siostr Marzae Vitae… – S. 21.
18 Ibid. – S. 35.
19 Цыт. па: К истории женского образования… – С. 4.
20 Там жа. – С. 5.
21 Там жа. – С. 5–6.
22 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі г. Мінск (далей – НГАБМ) – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 3826. – Арк. 1, 3, 5.

23 Никотин И. А. Столетний период (1772–1872) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876) / Никотин И. А. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1886. – Т. 2. – С. 179.
24 НГАБМ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 6922. – Арк. 1–1 зв., 12–12 зв., 13.
25 Там жа. – Арк. 1–1 зв.
26 Там жа. – Арк. 21–21 зв.
27 Там жа.
28 Там жа. – Арк. 1.
29 Там жа. – Арк. 2–3, 5.
30 Там жа.
31 Там жа; О подчинении женских пансионов при римско-католических манастырях гражданскому начальству // НГАБМ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 6922. – Арк. 12–12 зв., 13.
32 Дело о запрещении пансионов содержимых женскими римско-католическими монастырями // МДГА. – Ф. 2001. – Воп. І. – Спр. 195. – Арк. 5.
33 Из отчета витебского губернатора о состоянии образования и влияния католического духовенства на воспитание молодежи // Белоруссия в эпоху феодализма. – Мн.: Наука и техника, 1979. – Т. 4. – С. 354–355.
34 Там же. – С. 355.
35 Из отчета минского губернатора за 1842 г. о состоянии учебных заведений, типографий и библиотек губернии // Белоруссия в эпоху феодализма. – Мн.: Наука и техника, 1979. – Т. 4. – С. 355.
36 НГАБМ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 195. – Арк. 1.
37 Там жа. – Арк. 1 зв., 38–38 зв.

**Summary**
**Natalla Anofranka**
RUSSIAN IMPERIAL POLICIES TOWARDS WOMEN'S EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF CATHOLIC MONASTERIES IN THE LATE XVIII TH. – 1843 Г.
(Belarusian-Lithuanian provinces)
General trends of Russian imperial policies towards women's educational intuitions Catholic and Uniate monasteries in Belarusian-Lithuanian provinces since the partitions of Poland up to cancellation of this type of women's education in 1843 are analyzed in the articles.
**Key words**: Russian Empire, women's Catholic educational institutions, Catholic orders, monastic pansionates.